Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

18 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. СУБОТА

№ 118 (29740)

ЗВЯЗДА

ЧАМУ ЕЎРОПУ ЛІХАМАНІЦЬ? 3

ВЫСТАВА «МНЕ СНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ...» 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КАЛІ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫТРЫМАЕ, КРАІНА БУДЗЕ ЖЫЦЬ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сваёй рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць азнаёміўся, наколькі эфектыўна праводзіцца імпартазамяшчэнне ў сферы аўтапрама

Фота БелТА.

У Бабруйску кіраўнік краіны наведаў вядучыя машынабудаўнічыя прадпрыемствы — «Белшына» і «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскагламаш». Прадукцыя прадпрыемстваў карыстаецца стабільным попытам за мяжой, асноўная яе частка паступае ў Расію і Казахстан. Апошнія распрацоўкі гэтых прадпрыемстваў і іншых гігантаў аўтамабілебудавання можна было ўбачыць на выставе, арганізаванай на тэрыторыі «Бабруйскагламаша».

Прэзідэнт уважліва азнаёміўся з прадукцыяй кожнага прадпрыемства, пацікавіўся, якія ёсць праблемы, спытаў, як адбываюцца плацяжы, дыверсіфікацыя рынкаў, што прыносіць рабоце выкарыстоўваецца з імпартнага.

Нельга сказаць, што да стварэння імпартазамяшчальных тэхнікі, вузлоў і кампанентаў машынабудаўніцкую падштурхнулі санкцыі, шмат хто працаваў над гэтым і раней. Напрыклад, апошнія пяць гадоў намаганні 11 прадпрыемстваў холдынга «Аўтакампаненты» былі накіраваныя на праграму імпартазамяшчэння для канвеераў Беларусі і Расіі. Засвоена больш як тысяча відаў імпартазамяшчальнай прадукцыі, у найбліжэйшыя гады тут плануюць засвоіць не меншы аб'ём. На расійскі рынак паступае больш чым 80 % прадукцыі холдынга. «Страта рынкаў Еўропы і Украіны цалкам кампенсавана за кошт расійскіх», — пераканаў Прэзідэнта генеральны дырэктар ААТ «БАТЭ» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты» Аляксандр Марчанка. Сёння найбольш значны праект на новай лінейцы святлатэхнікі для аўто рэалізоўваецца на сярэднім па памерах прадпрыемстве, дзе працуе крыху больш за 500 чалавек, — ААТ «Рудзенск» пад Мінскам. Зараз холдынг шчыльна ўзаемадзейнічае з кампаніяй «Група ГАЗ» — буйным аўтавытворцам у Расіі.

Прэзідэнт пацікавіўся, ці жывыя гэтыя праекты, на што Аляксандр Марчанка адказаў сцвярджальна: эканамічны эфект нават вышэйшы, чым чакалі.

— Святлатэхніку на Расію пастаўлялі ў асноўным нямецкія і турэцкія кампаніі, зараз іх выцясняе наш холдынг, — паведаміў генеральны дырэктар.

Вялікая работа па імпартазамяшчэнні праводзіцца «МАЗам», 12 прадпрыемстваў холдынга за апошні год засвоілі шмат новых вырабаў, якія сёння выкарыстоўваюцца пры вытворчасці грузавікоў і аўтобусаў. Замешчаны імпартныя агрэгаты, вузлы, якія раней набывалі ў Заходняй Еўропе. Гэта, па словах генеральнага дырэктара ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ» Валерыя Іванковіча, дазволіла сэканоміць парадку 60 мільёнаў долараў па імпартазамяшчэнні за мінулы год. Прадпрыемства даказала, што здольнае паспяхова канкурыраваць і адказваць на тыя выклікі, якія стаяць перад ім, і выконваць узятыя перад урадам абавязацельствы. Канструктарскі штаб правадзіць вялікую работу, распрацавана дарожная карта, якая дазваляе крок за крокам вырашаць пытанні і рухацца наперад.

— Усе прадпрыемствы машынабудавання працуюць у адной звязцы, — падкрэсліў кіраўнік холдынга. — Мы пастаянна абменьваемся з калегамі тымі навінкамі, распрацоўкамі, якія зроблены за апошні час, а таксама тымі задачамі і думкамі, якія напрацаваны на дадзены момант. Гэта дазваляе быць у курсе таго, што кожны з партнёраў напрацаваў, і скааператавацца, каб у рамках партнёрства знайсці новыя моманты супрацоўніцтва.

Генеральны дырэктар ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-Холдынг» Сяргей Нікіфаровіч прадставіў новую буйнагабарытную інавацыйную тэхніку, пераважна якой не толькі ў магутнасцях, але і ў экалагічнасці. А яшчэ яна больш тэхналагічная, эканамічная і магутная.

СТАР. 2

Адказная і вельмі патрэбная прафесія

Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Віншую вас з прафесійным святам — Днём медыцынскіх работнікаў.

У вашых умелых і надзейных руках важнейшы рэсурс краіны — здароўе і жыццё кожнага чалавека. Гэту цяжкую, адказную і вельмі патрэбную прафесію выбіраюць толькі тыя, хто валодае бязмежным гуманізмам і жаданнем дапамагаць.

Дзякую за штодзённую карпатлівую працу ўрачам-практыкам, вучоным, спецыялістам санітарна-эпідэміялагічнай службы і лабараторнай дыягностыкі, правізарам і фармацэўтам, фельчарам і медыцынскім сёстрам, прадстаўнікам малодшага медыцынскага персаналу — усім, хто застаецца верным абавязку, шчыра і самааддана служыць людзям і Беларусі.

Упэўнены, і ў далейшым, захоўваючы традыцыі і пераемнасць, вы будзеце павышаць узровень і эфектыўнасць айчыннай аховы здароўя.

У гэты святочны дзень жадаю моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, а галоўнае — поспехаў у вашай высакароднай працы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БелТА.

У сям'і УКРАІНЦАЎ — нямала медработнікаў. Прычым чацвёра — у Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. Алена Украінец — загадчыца аддзялення гіпербарычнай аксігенацыі. Яе муж Станіслаў кіруе траўматалагічным аддзяленнем, а яго бацька Яўген — хірургічным. Мама Станіслава да пенсіі працавала эпідэміёлагам, цётка да гэтага часу працуе ў інфекцыйным аддзяленні, а тата Алены ў мінулым быў вядомым хірургам і шмат гадоў узначальваў абласную бальніцу. У гэтай сям'і ўжо два пакаленні дыпламаваных медыкаў, і дзеці Алены і Станіслава ўжо праяўляюць цягу да прафесіі бацькоў і дзядоў. ***На здымку:*** Яўген УКРАІНЕЦ *(у цэнтры)* з сынам Станіславам і нявесткай Аленай.

Больш чым работа

ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ Ў БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

Заўтра сваё прафесійнае свята адзначаюць людзі, бадай, самай высакароднай прафесіі — медыцынскія работнікі

У нашай краіне амаль 300 тысяч медыкаў, з іх каля 45 тысяч практыкуючых урачоў, 115 тысяч медыцынскіх сясцёр і братоў. Два гады наша медыцына пераадольвала нягоды шляхам барацьбы з COVID-19. За гэты час на сферу аховы здароўя выдзелена каля 2,3 мільярда рублёў, з іх на выплату надбавак медработнікам — больш за 1,5 мільёна. Бальніцы былі аснашчаны кіслароднымі пунктамі (цяпер у стацыянарах іх больш за 30 тысяч), камп'ютарнымі тамаграфамі і іншым неабходным абсталяваннем. У Беларусі за два месяцы наладзілі ўласную вытворчасць сродкаў індывідуальнай аховы, распіратараў, масак, дэзынфектараў. Была створана тэхналогія вытворчасці ўласнай вакцыны, наладжаны выпуск крытычна важных лекаў.

Аднак не забываліся ў гэты час і ў цэлым пра развіццё сферы аховы здароўя. Будаваліся новыя паліклінікі і карпусы бальніц, жыллё для медыкаў, закупляліся новае абсталяванне, асвойваліся новыя віды аперацый.

Вось толькі некалькі прыкладаў. Зусім нядаўна ў Мінску адкрылася 9-я дзіцячая паліклініка. Будынак узведзены на месцы старога. У будаўніцтва ўкладзена больш за 21,1 мільёна рублёў. Магутнасць новага 6-павяховага будынка — 400 наведванняў у змену. Усяго тут абслугоўваецца больш за 15 тысяч юных мінчан, працуюць 46 урачоў і 85 медсясцёр.

Крыху раней у Магілёве адкрылася дзіцячая паліклініка № 1. На новай базе спецыялісты медустановы працягнуць абслугоўваць дзяцей цэнтральнай часткі горада, а таксама будуць аказваць медпаслугі маленькім пацыентам некалькіх найбліжэйшых мікрараёнаў. Паліклініка разлічана на 250 наведванняў у змену.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Амерыканцы з-за высокай інфляцыі аказаліся на мяжы голаду

Жыхары ЗША з-за рэкордна высокага кошту бензіну, а таксама імклівага росту цэн на прадукты харчавання і тавары першай неабходнасці вымушаны масава звяртацца па харчовую дапамогу і адмаўляцца ад карыстання аўтамабілямі. Такую тэндэнцыю адзначыла The Washington Times. Выданне прыводзіць словы некалькіх жыхароў штата Фларыда, якія заўважаюць, што апынуліся ў крытычнай сітуацыі: яны не могуць дазволіць сабе цяпер купіць тыя прадукты харчавання, якія раней былі ім па кішэні. Людзі скардзяцца, што знаходзяцца ўвесь час у найманцнейшым стрэсе і перыядычна ўпадаюць у стан панікі. Адзін з кардынатараў мясцовых харчовых банкаў Джон Заўэр распавёў The Washington Times, што за апошнія месяцы колькасць тых, хто звяртаецца па бясплатную ежу, рэзка вырасла амаль на 60 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Міністэрства працы ЗША аб'явіла, што індэкс цэн вытворцаў, які вымярае кошт аптовых тавараў да таго, як яны трапяць на паліцы магазінаў, у мінулым месяцы ўзрос на 10,8 працэнта, у асноўным з-за больш высокіх затрат на паліва.

САА3 лічыць лета фактарам рызыкі распаўсюджвання воспы малпаў

Еўропа застаецца эпіцэнтрам успышкі воспы малпаў за межамі Афрыкі. У рэгіёне ўжо выяўлена больш за 1500 хворых, што складае 85 працэнтаў ад усіх выпадкаў заражэння ў свеце, паведаміў Euronews. Як прагназуюць у Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, улетку сітуацыя можа пагоршыцца. «У Паўночным паўшар'і наступіла лета з традыцыйным для яго турызмам, розных парадамі, музычнымі фестывалямі і іншымі масавымі мерапрыемствамі, запланаванымі па ўсім рэгіёне. Усё гэта спрыяе ўзаемадзеянню маладых, актыўных і вельмі рухомых людзей. Воспа малпаў не прычына для адмены мерапрыемстваў, але і магчымасць выкарыстоўваць іх для павышэння рызыкі заражанасці», — адзначыў дырэктар Еўрапейскага бюро САА3 Ханс Клюге. Як вядома, у асноўным захворванне перадаецца пры шчыльным кантакце паветрана-кропельным шляхам і праз заражанья прадметы. Таму, каб пазбегнуць далейшага распаўсюджвання захворвання, спецыялісты раяць удзельнікам масавых мерапрыемстваў самаізаляваца пры з'яўленні сімптомаў.

Звыш 770 мільёнаў дарослых людзей не ўмеюць чытаць і пісаць

У свеце налічваецца больш чым 770 мільёнаў дарослых людзей і 126 мільёнаў маладых людзей, якія не ўмеюць чытаць ці пісаць простыя фразы. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Одры Азуле, якая выступіла на VII Міжнародай канферэнцыі па адукацыі дарослых у Маракешы. Тут разглядаліся прыклады эфектыўнай палітыкі навучання і адукацыі дарослых, якія садзейнічаюць дасягненню Мэт устойлівага развіцця ААН. Гендырэктар ЮНЕСКА адзначыла, што дзве трэці ад агульнай колькасці чалавек, якія не ўмеюць чытаць або пісаць, складаюць жанчыны. Одры Азуле заклікала працягваць распаўсюджванне праграмы па забеспячэнні ўсеагульнай адукацыі дарослых.

КАРОТКА

- **У Беларусі больш за Br4 млн выдзелена за год на падтрыманне ў парадку воінскіх пахаванняў.**
- Зняты летнія абмежаванні на платных участках рэспубліканскіх дарог.
- **Ліцэі, каледжы і ВНУ тэхнічнага профілю будуць рыхтаваць спецыялістаў для платформы «Разумны горад».**
- Электрычныя мінівэны плануюць выраблять у Беларусі.
- **Харваты далучыцца да зоны еўра з 1 студзеня 2023 года.**
- Еўрапейскія санкцыі, уведзеныя супраць Масквы, могуць быць адмененыя Еўрасаюзам толькі пры ўмове завяршэння Расіяй ваеннай спецаперацыі ва Украіне, вываздзе расійскіх войскаў і тэхнікі з яе тэрыторыі.

Ёсць пытанне

ЗДАРОЎЕ АД ПРЫРОДЫ

Ці варта верыць у рэцэпты народнай медыцыны і ці апраўдана мода на арганічныя прадукты харчавання?



Чаму і ў нашы дні крыніцай цэлага шэрагу лекавых рэчываў па-ранейшаму застаюцца расліны? Як прымусіць расліну прадуцыраваць патрэбныя чалавеку рэчывы, якія не з'яўляюцца для самога расліннага арганізма жыццёва важнымі? Чым небяспечная генна-мадыфікаваная бульба? Ці эфектыўны сінтэз народнай медыцыны і сучасных тэхналогій? Пра гэта гутарым з доктарам біялагічных навук, акадэмікам НАН Беларусі, прафесарам Уладзімірам РАШЭТНІКАВЫМ.

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«КАЛІ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫТРЫМАЕ, КРАІНА БУДЗЕ ЖЫЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Найбольш перспектыўныя рынкі — Расія, Кітай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем разам думаць, як пераадольваць цяжкасці. Трэба актыўней задзейнічаць малаэфектыўную вытворчасць. І гэта прадпрыемства («Бабруйскаграмаш». — **Аўт.**) магло дрэнна працаваць, але ж утрымалася. А то хвалімся: тэхніка добрая, а палова камплектуючых імпартная. Трэба працаваць над тым, каб іх было меней. Калі прамысловасць вытрымае, краіна будзе жыць.

Прэзідэнт выказаўся таксама наконт таго, што ў далейшым будзе праводзіцца работа па ўзмацненні такіх гарадоў, як Бабруйск і меншых. Менавіта ходы павінны быць прыцягнутыя спецыялісты, для іх тут павінны стварацца ўмовы і будавацца жылля.

* * *

Падчас візіту на «Белшыну» Прэзідэнт, пасля таго, як азнаёміўся з прадукцыяй, сустрэўся з працоўным калектывам. Яго сустрэлі апладысментамі.

ПРАБЛЕМ ДАСТАТКОВА, АЛЕ ЎСЁ МОЖНА РАШЫЦЬ

— Сітуацыя ў свеце няпростая, але, як сказаў губернатар (Анатоль Ісачанка, старшыня Магілёўскага аблвыканкама. — **Аўт.**), у гэтым ёсць плюс — будзем цяпер ствараць сваё, — павеламіў Прэзідэнт. — Яно так і ёсць. Сітуацыя прымусіла актывізавацца. Раней шмат куплялі, цяпер трэба нешта самім рабіць. Але супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі ніхто не адмяняў. Той жа каўчук для шын бяром у В'етнаме. Пашыраем супрацоўніцтва з Інданезіяй, Індыяй, Кітаем. Спачатку перажылі выпрабаванне каранавірусам, зараз знешняя інфляцыя ўздзейнічае на нас. Але пабачыце, праз год-два ўсё зменіцца. Зараз ідзе перадзел свету. І нам трэба выстаяць. У нашай прадукцыі зацікаўлена Расія, іншыя краіны. Бабруйск будзем развіваць. Менш у Мінску будзем будаваць, а развіваць меншыя гарады. Праблем дастаткова, але ўсё можна вырашыць.

Работніца прадпрыемства паабяцала, ці вытрымае краіна тыя цяжкасці, якія сёння даводзіцца пераадольваць.

— Вытрымаем, — паабяцаў Прэзідэнт. — Калі б вы не перашкаджалі вытворцам амерыканскім, еўрапейскім, яны б на нас не цяснулі. Гэта канкурэнцыя. Пад прыкрыццём правоў чалавека яны хацелі краіну перавярнуць. А вы перашкаджаеце ім. Мы высокатэхналагічная адукаваная нацыя. У нас ёсць усе для таго, каб канкурыраваць. Мы запатрабаваныя. Сёння галоўнае — грошы. У чым справа? Прадайце больш шын — атрымаеце грошы. Чэргі стаяць па вашу прадукцыю. Ёсць праблемы з праходжаннем плацяжоў, але мы і тут знаходзім шляхі. Мы можам 80 % пастаўляць у Расію. У свеце недахоп калійных угнаенняў, і гэта адчуваецца. Дыктат з боку амерыканцаў і еўрапейцаў надакучыў краінам. Праз два гады будзе інакш, пабачыце.

УКРАІНА — АДЗІН З ЭЛЕМЕНТАЎ ПЕРАДЗЕЛУ СВЕТУ

Яшчэ адна работніца пацікавілася, як доўга працягнецца вайна ва Украіне, ці атрымаецца далей супрацоўнічаць.

— З Украінай цяжкае становішча, — канстатаваў Прэзідэнт. — Гэта мужны, моцны народ, але нацыяналізм, нават нацызм яны там паставілі на першае месца. Прагнозу, як будзе сітуацыя развівацца, ніхто не ведае. Усё толькі пачынаецца. Украіна — адзін з элементаў перадзелу свету. Будуць трашчаць маленькія дзяржавы, такія як мы. Еўропа гатова размаўляць, але амерыканцы супраць. Яны мараць пра Заходнюю Украіну. Я казаў, што украінцы яшчэ будуць прасіць, каб мы іх абаранілі. У Польшчы да ўлады прыйшлі радыкалы, якім амерыканцы даюць грошы. Мы ўзмацнілі нашы граніцы, але нас штурхаюць, правакуюць. Галоўнае — не ўцягвацца. Нам вайна не патрэбна. Пакуль атрымліваецца мірыцца. Учора ва Украіну прыехалі еўрапейскія лідары. Там не было амерыканцаў, англічан, палякаў. З якой мэтай яны туды завіталі, пакуль невядома. Ніхто не ведае, як будзе развівацца далейшая абстаноўка. Расія пакуль вядзе звычайнай зброяй, але ў яе ёсць іншая, новага ўзроўню. Амерыканцы адчуваюць, што прайграюць, і спрабуюць кантраляваць сітуацыю. Ва Украіну мы не збіраемся заходзіць, але калі нехта пяройдзе нашу граніцу, ім мала не будзе. І народнае апалчэнне створым. Чым болей будзем умець, тым спакайней будзе нам жыць.

У НАС ЁСЦЬ СВОЙ КАВАЛАЧАК ЗЯМЛІ, І ГЭТА ЦУДОЎНА

Бабруйчан таксама цікавіла тэма патрыятычнага выхавання, захавання праўды пра Вялікаю Айчыннюю вайну.

— Дзецям і дарослым трэба казаць пра вайну, — падкрэсліў Прэзідэнт. — На той вайне 30 мільёнаў загінулі. Дагэтуль знаходзім у сваёй зямлі ахвяр фашыстаў. Трэба кожны помнік захаваць, такім чынам выхоўваць. Трэба бераглы і развіваць свае населеныя пункты. Перамога — гэта наш агульны здабытак. У нас ёсць свой кавалачак зямлі, і гэта цудоўна.

На пытанне «Як у вашым сямействе праразгаварыла на новае свята — Дзень бацькі?» Прэзідэнт адказаў з гумарам, маўляў «сюрпрызу не атрымалася»: «Я ж падпісаў указ, яны былі ў курсе».

— Пагадзіцеся, было несправядліва, што ў жанчын свята ёсць, а ў нас няма. Павінна быць і ў нас, — канстатаваў кіраўнік краіны. — Калі ў кожнага беларуса 5—7 дзяцей будзе, краіна закветнее. Для пачатку можна трох, каб прырост быў. І тады нам ніхто не страшны. Будзем жыць!»

На прадпрыемстве Прэзідэнту, як аматару хакея, прэзентавалі набор шайб. На што ён з павагай сказаў: «Малайцы, добрую прадукцыю ствараеце».

Нэлі ЗІГУЛЯ,
Бабруйск.

❍ Каментарый у тэму

Руслан СТРАХАР, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:

— Магілёўская вобласць — буйны прамысловы рэгіён, болей чым 30 % валавога рэгіянальнага прадукту фарміруюць менавіта прамысловая прадпрыемствы. І ў гэты нялёгкі час мы бачым, што большасць прадпрыемстваў ужо пераарыентавалася або намацвае новыя кірункі. Большасць прадпрыемстваў прамысловага комплексу працуе ў штатным рэжыме. Той жа «Бабруйскаграмаш» — буйное сельскагаспадарчае машынабудаванне, дзе прадстаўлены цэлы шэраг навінак і новых кірункаў, якія мы плануем развіваць. Тэма імпартазамяшчэння актуальная для нашага рэгіёна, і мы будзем яе развіваць. Сёлета мы плануем вырабіць імпартазамяшчальнай прадукцыі на 820 мільёнаў, з тэмпам 115 % да мінулага года. Кожны год уцягваем усё больш прадпрыемстваў, і ў сёлетняй праграме імпартазамяшчэння ўжо ўдзельнічаюць 115 прадпрыемстваў. Збіраемся вырабіць сёлета 188 найменняў імпартазамяшчальнай прадукцыі. У гэту праграму актыўна ўцягваем малы і сярэдні бізнес, і па мінулым годзе ўжо 60 % менавіта такіх прадпрыемстваў было ў праграме імпартазамяшчэння. У каапэрацыі малога і сярэдняга бізнесу з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі збіраемся знайсці новыя нішы і рухацца наперад.

ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ Ў БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Новая дзіцячая паліклініка адкрылася і ў Жодзіне. Будынак, выкананы па індывідуальным праекце, размясціўся ў самым цэнтры горада і разлічаны на 300 наведванняў за змену. У чатырохпавярховай паліклініцы размясціліся ўтульныя кабінеты з сучасным абсталяваннем, у тым ліку стаматалагічным, лабараторным, дыягнастычным, фізіятэрапеўтычным. Кабінеты паліклінікі, вядома ж, забяспечаны інфармацыйным абсталяваннем, камп'ютарнай сеткай, электронай чаргой. Гэта значыць, усё задумана так, каб устаць на рэйкі электронай аховы здароўя з моманту адкрыцця.

А вось у Барысаве закончана будаўніцтва кааператыва «Медык». На вуліцы Ватуціна з'явіўся жылы дом на 104 кватэры, які стаў цудоўным падарункам маладым сем'ям медработнікаў Мінскай вобласці.

Барысаўская ЦРБ — адна з самых буйных бальніц у вобласці, дзе стварваецца спецыялізаваны цэнтр высокатэхналагічнай меддапамогі, на базе якога з'явіцца ўнікальныя магчымасці для аказання меддапамогі. Два камп'ютарныя тамографы, МРТ і ангіёграф у Барысаве ўжо ёсць. Цяпер завяршаецца будаўніцтва дзіцячага шматпрофільнага корпуса.

На працягу гэтага года адбудзецца і адкрыццё новай дзіцячай бальніцы ў Барысаве. Актыўна вядзецца будаўніцтва новай паліклінікі ў Баруўлянах і паліклінікі ў вёсцы Азярцо Мінскага раёна. Гэтыя аб'екты сістэмы аховы здароўя таксама плануецца адкрыць у 2022 годзе.

Шэраг медыцынскіх устаноў будуецца і ў іншых рэгіёнах. У Віцебску ўзводзяцца новыя карпусы абласнога клінічнага спецыялізаванага цэнтра. У Гродне — новы анкацэнтр. Увесь аб'ект будзе здадзены ў 2025 годзе. Будуюць яго ў рамках інвестпраграмы за кошт рэспубліканскага бюджэту. Анкадыспансер разлічаны на 312 месцаў, наведвальнасць — 300 чалавек у дзень. Тут будзе восем карпусоў, у тым ліку два лячэбныя, аперацыйны, радыелагічны, лабараторна-дыягнастычны, анкадыспансер, кафедры, паталагаанатамічнае аддзяленне і пансіянат.

У сталіцы напрыканцы гэтага года завершыцца будаўніцтва новага корпуса РНПЦ «Кардыялогія». Цяпер у новым корпусе (а яго прызначэнне — гібрыдная кардыяхірургія) абсталёўваюць аперацыйныя. Умовы ў іх дазволяць хірургам больш эфектыўна працаваць, а пацыентам — лепш аднаўляцца пасля аперацый. На новых плошчах размесціцца рэанімацыйнае аддзяленне на пяць рэанімацыйных боксаў, тут будзе абсталявана 12 спецыялізаваных ложкаў. Акрамя таго, у корпусе плануецца размясціць аддзяленне інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі для пацыентаў кардыяхірургічнага профілю, а таксама навуковыя лабараторыі цэнтра.

Што датычыцца аплаты работы медыкаў, кіраўніцтва краіны прымае меры, каб яна не знізілася пасля адмены «ковідных» надбавак. Напярэдадні прафесійнага свята міністр аховы здароўя **Дзмітрый ПІНЕВІЧ** анансаваў змяненні ў сістэмы аплаты працы. Ён адзначыў, што ў хуткім часе будзе прыняты дакумент, які фармалізуе прэзідэнцкія даручэнні наконт гэтага. Кіраўнік дзяржавы даваў іх у тым ліку ў ходзе шматгадзінных паездак у рэгіёны, наведваньі лячэбных устаноў.

— Там менавіта давалося ўказанні, прымаліся стратэгічныя рашэнні. Літаральна некалькі дзён — і будуць выкрышталізаваны рашэнні кіраўніка дзяржавы. Па яго даручэнні прапрацавана ўрадам, якое будзе павышэнне зарплат медыцынскім работнікам, — расказаў Дзмітрый Піневіч.

Павышэнне зарплат ахопіць усіх медыкаў краіны.

— Але ў некаторых катэгорый, якія працуюць, з нашага пункту гледжання, на больш важных, складаных участках, гэта павышэнне зарплаты будзе большым, — падкрэсліў міністр.

Алена КРАВЕЦ.

Кампетэнтна

Валерый НЕДЗЕНЬ, галоўны пазаштатны стаматолаг Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, галоўны ўрач 7-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска, напярэдадні прафесійнага свята атрымаў ганаровае званне «Выдатнік аховы здароўя»:



— У нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага матэрыяльна-тэхнічнай базе медыцынскіх устаноў, у тым ліку абнаўленню абсталявання. У хуткім часе пасля капітальнага рамонту адкрыецца Мінскі гарадскі дзіцячы клінічны цэнтр па стаматалогіі. Гэта цалкам сучасны праект з абноўленымі інжынернымі сеткамі і самым сучасным стаматалагічным абсталяваннем.

Зусім нядаўна ўведзены ў эксплуатацыю новы будынак 9-й гарадской дзіцячай паліклінікі. У сакавіку пасля капітальнага рамонту адкрылася 16-я гарадская паліклініка, якая прымае дарослых. У абедзвюх маюцца стаматалагічныя аддзяленні, аснашчаныя найноўшым абсталяваннем.

Цяпер працягваецца мадэрнізацыя 36-й гарадской і 19-й дзіцячай паліклінік, якія будуць цалкам перааснашчаны. Што датычыцца стаматалагічных аддзяленняў, то там таксама будзе заменены стаматалагічны парк: і стаматалагічныя ўстаноўкі, і рэнтгенабсталяванне.

На мой погляд, матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў аховы здароўя, абсталявання, якое маецца, дазваляюць нам выкарыстоўваць самыя сучасныя тэхналогіі ў стаматалогіі. А кваліфікацыя і кампетэнцыі нашых медыцынскіх работнікаў, якіх, карыстаючыся выпадкам, я віншую з прафесійным святам, дазваляюць аказваць паслугі любога ўзроўню складанасці.

Парламенцкі дзённік

Дзейснасць зваротаў і інтэграцыя інвалідаў

Аб гэтым, а таксама аб якаснай псіхалагічнай дапамозе, разумным абыходжанні з адходамі гаварылі падчас чарговага пасяджэння восьмай сесіі Савета Рэспублікі

Адобраны сенатарамі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» накіраваны на ўдасканаленне прававога рэгулявання адносін, якія датычацца сферы падачы і разгляду зваротаў грамадзян, а таксама юрыдычных асоб з мэтай найбольш поўнай абароны іх правоў і законных інтарэсаў.

— Нязменным прыярытэтам для ўсіх галін улады і дзяржаўных органаў, у тым ліку Савета Рэспублікі, з'яўляецца работа са зваротамі грамадзян, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага саюза па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**. — Рэспубліканскі семінар-нарада «Актуалізацыя метадаў і форм работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні», які адбыўся з удзелам кіраўніка дзяржавы, зваротны раз наглядна пацвердзіў, што для эфектыўнага ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і службовых асоб з насельніцтвам неабходная актуальная і запатрабавальная на практыцы заканадаўчая база. Прадстаўлены законапраект накіраваны на ўдасканаленне парадку разгляду зваротаў, у тым ліку з улікам новых метадаў камунікацыі, на фарміраванне аднастайнай правапрымяльнай практыкі ў гэтай сферы.

Звярнуўшы ўвагу на актуальнасць законапраекта, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алег ДЗЯЧЭНКА** расказаў, што ў павестцы дня стаіць пытанне аб тым, каб узмацніць работу з насельніцтвам, са зваротамі грамадзян. «Галоўнае, каб мы працавалі для людзей, каб кожны грамадзянін мог звярнуцца да той службовай асобы, да якой хоча, — удакладніў сенатар. — Яшчэ больш важна, каб гэты зварот быў дзейсным, каб, разгледзеўшы яго, мы маглі якасна вырашыць пастаўленую задачу».

Таксама сенатары адобрылі законапраект «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Яго асноўнай асаблівасцю з'яўляецца паўнапраўнае ўключэнне людзей з інваліднасцю ў грамадства, а таксама рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў, стварэнне даступнага асяроддзя і паляпшэнне якасці жыцця інвалідаў, падтрымка сем'яў з інвалідамі.

Прадстаўляючы законапраект, **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЮЕВІЧ** заўважыла, што людзі з інваліднасцю займаюць асаблівае месца ў сістэме дзяржаўнай і сацыяльнай падтрымкі. «Шэсць працэнтаў насельніцтва краіны, а гэта больш чым паўмільёна чалавек, — людзі, якія маюць інваліднасць, — павеламіла міністр. — Яшчэ на мяжы 2000-х лічылася, што асноўная мэта дапамогі інвалідам — аказанне матэрыяльнай падтрымкі. У сучасным свеце задачы трансфармаваліся. Наша ключавая мэта — інтэграваць людзей з інваліднасцю ў грамадства».

Законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі», таксама адобраны членамі Савета Рэспублікі, распрацаваны з мэтай паляпшэння даступнасці і якасці псіхалагічнай дапамогі, стварэння больш спрыяльных умоў для яе аказання. Як заўважыла **першы намеснік міністра аховы здароўя Алена КРАТКОВА**, дапамога праз інтэрнэт неабходная, асабліва для маладога пакалення. «У пашыраныя паўнамоцтвы бярэцца права выкарыстоўваць яе і на платнай аснове, — удакладніла першы намеснік міністра. — Чакаецца, што цікавасць з боку псіхолагаў на аказанне новага віду дапамогі будзе вялікая. Адпаведна, і даступнасць для аказання дапамогі палепшыцца».

Станоўчую ацэнку атрымаў і законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі». Дакумент прадугледжвае перараз-меркаванне паўнамоцтваў Прэзідэнта ў частцы ўстанаўлення патрабаванняў да абыходжання з адходамі, якія ўтвараюцца пасля страты таварамі і ўпакоўкай сваіх спажывецкіх якасцяў. Гэтыя паўнамоцтвы цяпер будуць ускладзены на ўрад. Акрамя таго, за юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) увоз тавараў, замацоўваюцца абавязкі па забеспячэнні збору, абяскшкоджання і (або) выкарыстання адходаў тавараў і адходаў упакоўкі, якія ўтварыліся пасля страты імі спажывецкіх якасцяў.

Паводле БелТА.

Спрошчанае будаўніцтва і гарантыі донарам

Падчас чарговага пасяджэння восьмай сесіі сёмага склікання дэпутаты разгледзелі 13 законапраектаў

Адзін з іх — «Аб змяненні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі» — накіраваны на ўдасканаленне зямельных адносін. Падчас дапрацоўкі законапраекта былі ўлічаны даручэнні кіраўніка дзяржавы, агучаныя падчас нарады па зямельным пытанні ў лютым гэтага года. Актуальнасць дапаўненняў у Зямельны кодэкс у першую чаргу абумоўлена вялікай колькасцю зваротаў грамадзян да органаў улады па пытаннях землеўладкавання і землякарыстання, архітэктуры і будаўніцтва, якія складаюць 11 % ад усіх зваротаў.

ПАДТРЫМКА ВА ЎМОВАХ САНКЦЫЙ

У прыватнасці, прапануецца ўстанавіць, што раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты будуць мець права ўносіць у адносінах да землекарыстальнікаў рашэнні аб дазволе здзяйснення здзелак і іншых дзеянняў з зямельнымі ўчасткамі. У мэтах выключэння карупцыйных праяўленняў, а таксама эфектыўнага выкарыстання «залатых» земляў прыгарадных раёнаў Мінска і абласных цэнтраў адным з такіх умоў будзе з'яўляцца ўнясенне землекарыстальнікам аплаты за зямельны ўчастак па яго рынкавым кошце, але не ніжэй за кадастравы кошт.

У выпадку, калі зямельны ўчастак раней быў выкуплены ў прыватную ўласнасць па кадастравым кошце, землекарыстальнікам будзе ажыццяўляцца даплата розніцы паміж рынкавым і кадастравым коштам зямельнага ўчастка. Таксама прапанаўецца ўстанавіць, што пасля ўступлення ў сілу закона на працягу трох гадоў Мінскі гарадскі, абласныя выканкамы па ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы будуць мець права прымаць рашэнні аб лёсе зямельнага ўчастка пры самавольным яго занятці.

У першым і другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект аб сацыяльнай падтрымцы насельніцтва. Ён абумоўлены ўвядзеннем эканамічных і іншых санкцый у адносінах да нашай краіны, эканамічнай сітуацыяй, якая складваецца ў свеце.

— У аснове дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь заўсёды быў, ёсць і будзе чалавек, — падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі па праўдзе і сацыяльных пытаннях Іна КРАЧАК**. — Невыпадкова вялікая ўвага ўдзяляецца падтрымцы не толькі сацыяльна ўразлівых слаёў насельніцтва, але і працаздольных людзей. Ураду даецца права ў 2022 годзе ў залежнасці ад макраэканамічнай сітуацыі своечасова карэкціраваць бюджэт пражытачнага мінімуму, мінімальную заработную плату, ажыццяўляць дадатковыя выплаты асобным катэгорыям грамадзян. Сёння бюджэт пражытачнага мінімуму карэкціруецца кожны квартал у цэнах апошніх чысла месяца. Мінімальная заработная плата ўстанаўліваецца на 1 студзеня бягучага года. Гэтым законам ураду даецца права ў ручным рэжыме рэгуляваць эканоміку, выплаты заработнай платы на гэты год.

Закон разгледжаны адразу ў двух чытаннях: 2022 год ужо ідзе, сітуацыя мяняецца, таму ёсць неабходнасць даць магчымасць ураду ажыццяўляць сваю рэгуляцыйную функцыю. Па словах **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя КАВАЛЬКОВА**, да рэалізацыі прапанаванага шэраг мер, якія ва ўмовах санкцыйнага ціску дазволяць пры высокай інфляцыі сфарміраваць гнуткі механізм падтрымкі ўзроўню даходаў насельніцтва, не дапусціць дысбалансу ў росце асноўных відаў даходаў, забяспечыць рацыянальнае расходаванне бюджэтных сродкаў на кампенсацыю насельніцтву ад страт ад інфляцыі.

УЗРОСТ ДОНАРА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Адзін з рэзанансных законапраектаў, разгледжаных падчас пасяджэння сесіі, звязаны з пытаннямі донарства крыві і яе кампанентаў. Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянціны КУРСЕВІЧ**, нягледзячы на высокі ўзровень развіцця навукі і медыцыны, донарская кроў застаецца стратэгічным рэсурсам нашай краіны, нацыянальным элементам яе бяспекі. «Адзінай крыніцай донарскай крыві з'яўляюцца донары, — удакладніла дэпутат. — Гэта здаровыя людзі, якія на добраахвотнай аснове здаюць сваю кроў і кампаненты, што выкарыстоўваюцца ад ліку медыцынскіх мэт (напрыклад, для ратавання жыцця, калі патрабуецца дапамога пры праведзенні хірургічных аперацый, трансплантацыі органаў і тканак, акушэрска-гінекалагічных сітуацыях), або для прамысловай вытворчасці лекавых прэпаратаў і медыцынскіх вырабаў».

Перад тым, як унесці змяненні і дапаўненні ў дзеючае заканадаўства, парламентарыі двойчы правялі грамадскае абмеркаванне дадзенага заканапраекта. Аб'ехаўшы амаль усе абласныя цэнтры, сустрэўшыся як з работнікамі службы крыві, так і з донарамі, яны ўлічылі каля 130 прапаноў і заўваг. У прыватнасці, па прапановах шматлікіх донараў, плануецца павялічыць узрост донараў з 60 да 65 гадоў. Упершыню прадугледжана раздзяліць донарэў па катэгорыях з залежнасці ад тагу, для якіх мэт будзе выкарыстана іх кроў: медыцынскіх або для прамысловай вытворчасці лекавых прэпаратаў і медыцынскіх вырабаў. Акрамя таго, за дзяржавай будзе захавана аднасобнае права па нарыхтоўцы і перапрацоўцы крыві і яе кампанентаў, забараняюцца вывозіць за межы краіны прэпараты, выраблены з крыві. Уводзіцца практыка па нарыхтоўцы крыві і яе кампанентаў, вызначаны статус гематалагічнага нагляду, які ў тым ліку будзе ажыццяўляць міністэрства аховы здароўя. Вызначаны пералік мерапрыемстваў па прапагандзе донарства з ацэнкам на развіццё бязвыплатнага донарства. «Усе кампенсацыі, гарантыі донарам будуць захаваны, — акцэнтавала ўвагу Валянціна Курсевіч. — Будзе захавана і ўзнагароджванне нагрудным знакам «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь». Прапануецца, што пашырыцца сацыяльны пакет донарам, якія будуць мець гэтую ўзнагароду».

— Уводзіцца новы кірунак дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі — дзяржаўная падтрымка маладзёжных ініцыятыў, — расказаў праз яшчэ адну навацыю **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ**. — Пашыраны падыходы да аказання падтрымкі маладзёжных грамадскіх арганізацый шляхам вылучэння на канкурснай аснове бюджэтных сродкаў на рэалізацыю маладзёжных ініцыятыў, якія ініцыіруюцца маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі, зарэгістраванымі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку або ініцыятыўнымі групамі з ліку грамадзян. З улікам падыходаў, выпрацаваных на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы ў верасні 2021 года, прапануецца каардынаваць рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў вызначыць грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Прынята вышэйназваная норма дазволіць ўкараняць запатрабаваныя моладдзю формы і метады работы, павысіць матывацыю маладзёжных грамадскіх арганізацый, асобных маладых грамадзян, іх уключэнне ў існуючыя сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя і іншыя працэсы.

Фота БелТА

Наш фармат

Алеся КУЗНЯЦОВА:

«"ВЫТОКІ" — ГЭТА ПЕРШЫ КРОК ДА АСАБІСТАГА АЛІМПУ»

Лета ў рытме свята працягваецца. Спартыўна-культурны фестываль «Вытокі» ў гэтыя выхадныя прымае Навагрудак. Праграма нязменная: алімпійскі квэст, майстар-класы, выстаўкі, канцэрт арганнай музыкі, яркае шоу. І ўсё гэта з каларытам старажытнага горада. Кожны ахвотны знойдзе для сябе занятак па душы. А тым, хто хоча проста расслабіцца і выдатна правесці час, варта ўнесці ў свае планы на выхадныя канцэртную праграму фестывалю «Вытокі». У Навагрудку добры настрой гледачам будуць дарыць заслужаныя артысты Беларусі Ірына Дарафеева і Жанэт, арт-група «Беларусы», група «Дразды», спявак Герман, прадстаўніца Беларусі на «Славянскім базары» Ганна Трубяцкая і многія іншыя цікавыя артысты. Сумна дакладна не будзе. Арганізатар канцэртных праграм фестывалю «Вытокі», дырэктар прадзюсарскага цэнтра «Залатыя галасы» Алеся КУЗНЯЦОВА расказала, чаму канцэртная праграма свята — тое, што варта ўбачыць.

— Алеся, раскажыце, калі ласка, што ў гэтым годзе новага ў канцэртнай праграме фестывалю «Вытокі»?

— Сёлета мы дадалі тэатралізаваную частку, прысвечаную важным старонкам гісторыі кожнага горада. Усюды яна розная. Зараз ідзе Год гістарычнай памяці. Кожнае месца ў нашай краіне ўнікальнае, кожнае мае сваю цікавую гісторыю. Але не ўсе пра гэта ведаюць. І ў Год гістарычнай памяці было б лагічна пазнаёміць шырокую аўдыторыю са знакавымі момантамі з гісторыі горада. У Рэчыцы — шлях «з варагаў у грэкі», у Століне — тэатр Радзівілаў. Літаральна за восем хвілін акцёры разыгрываюць паміж сабой гісторыю, з якой гледачы могуць убачыць, што адбывалася на гэтых землях, як людзі тут жылі, што іх хвалявала. Гэтым мы падкрэсліваем прыгажосць і багацце нашай зямлі, нагадваем пра традыцыі, закладзеныя нашымі продкамі. Рэжысёр гэтай замалёўкі — Уладзіслава Арцюкоўская.

«Мы ўжо бачым цікавасць, гараджане самі просяць у наступным годзе правесці фестываль у іх. Сёлета ў кожным горадзе мяняецца спіс артыстаў».

— У Навагрудку такой старонкай стануць статуты Вялікага Княства Літоўскага. Раскрыйце, калі ласка, сакрэт, як артысты пакажуць зводу законаў?

— Мне пашчасціла на свае вочы бачыць арыгінал аднаго са статута падчас гастроляў па Прыбалтыцы. І я здзівілася, што магу яго прачытаць: старабеларуская мова нам зразумелая. Справа ж не толькі ў зводзе законаў. А ў тым, што на нашых землях ўзнік самы першы звод законаў, ён быў напісаны ў тыя часы, калі ў многіх еўрапейскіх краінах нічога падобнага не існавала. І пазней гэты звод стаў асновай для канстытуцый многіх краін. Я думаю, мы павінны аб гэтым казаць і падкрэсліваць такое дасягненне нашых продкаў. Тым больш што Навагрудак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, першай дзяржавы на нашых землях.

— Па вольце фестывалю ў Рэчыцы і Століне, як людзі рэагуюць на такую пастаноўку?

— У Рэчыцы падчас самай першай пастаноўкі я мэтанакіравана назірала за гледачамі. Мы эксперыментуем, і нам цікава паглядзець, як людзі на гэта рэагуюць. І мінакі, якія проста падышлі паглядзець, што тут адбываецца, сядалі ў зале і заставаліся. Відаць, ім гэта цікава. Мы падаём гістарычныя факты ў незвычайнай форме: з канфліктам, драмай, наколькі гэта магчыма за восем хвілін. Такая пастаноўка будуецца па ўсіх тэатральных законах і выглядае вельмі цікавай.

— Цікавы і канцэрт арганнай музыкі. У мінулым годзе ён вылікаў вялікі рэзананс.

— Сапраўды, у мінулым годзе на кожным канцэрце былі поўныя залы. Але мы ж хочам абнаўляцца. І я прапанавала сёлета разгледзець нейкі іншы фармат. Але калегі сказалі, што адназначна трэба пакідаць канцэрт арганнай музыкі. У нейкай ступені гэта ўнікальная падзея. Арган — не распаўсюджаны інструмент, але ён традыцыйны для Беларусі. Наш арганіст Валерый Шмат захоплены музыкант. І акрамя таго, што вядомы як кіраўнік арт-групы «Беларусы» і кампазітар, арганная музыка — яго хобі. І адноўкі ён сам стаяў чарцяжы, па якіх і зраблі гэты арган. У чым яго ўнікальнасць? Інструмент не электронны, а семплерны. Гэта азначае, што на ім можна іграць гукамі іншых рэальных арганаў. Валерый садзіцца за інструмент і вырашае, што сёння ён будзе іграць гукамі аргана, які знаходзіцца ў Лондане ці ў Берліне. І ён можа пра кожны з гэтых арганаў расказаць. Людзі прарабілі вялізную работу, яны запісалі гучанне кожнай клавішы пры кожным рэгістры кожнага асобна ўзятага аргана. І гэтая тэхналогія дазваляе выбрацца патрэбны арган.

У мінулым годзе ў Мінску мы вырашылі правесці эксперымент: любім гэта. У канцэртнай зале «Верхні горад» мы паспрабавалі спалучыць два арганы — духавы з канцэртнай залы і наш семплерны. Спачатку Валерый выступаў на духавым, а затым перайшоў на семплерны. І глядач мог сам вырашыць, у чым іх розніца.

Унікальнасць канцэрта арганнай музыкі і поспех у тым, што Валерый не толькі іграе і спявае, а паглыбляе ў розныя музычныя эпохі, стылі, напрамкі. І людзі адчуваюць усе грані музыкі. А публіка ўсюды адпаведная. Што ў сталіцы, што ў раённым цэнтры людзі адпаведна адчуваюць цудоўнае і адгукаюцца на гукі аргана.

— Падзяліцеся, калі ласка, як рыхтаваць праект, які праходзіць кожныя два тыдні і пры гэтым у кожным горадзе са сваімі асаблівасцямі?

— У мінулым годзе была адна канцэпцыя, адна каманда артыстаў, адноўкавая для ўсіх праграма. І мы кожныя два тыдні ездзілі ў розныя гарады. Але было дастаткова цяжка растлумачыць мясцовым арганізатарам, што такое «Вытокі». Сёлета з гэтага пункту погляду прасцей. Мы ўжо бачым цікавасць, гараджане самі просяць у наступным годзе правесці фестываль у іх. Сёлета ў кожным горадзе мяняецца спіс артыстаў. Усюды разам з намі вандруюць арт-група «Беларусы», віртуоз-балалаечнік Аляксандр Варанішча і група «Дразды», нязменны і вядучы — акцёр тэатра і кіно Руслан Чарнецкі. Усе астатнія артысты — сюрпрыз для горада. І іх трэба сабраць разам. Гэта не заўсёды проста. Але дапамагае вопыт. Я амаль 20 гадоў займаюся арганізацыяй канцэртаў, гастрольных тураў. З арт-групай «Беларусы» было такое, што ў нас за 17 дзён было 13 канцэртаў у трох розных краінах. І трэба было арганізаваць усе пераезды. Таму дзякуючы вопыту мы спраўляемся. У нас выдатная каманда арганізатараў. Для мяне вялікі гонар і радасць — займацца гэтым фестывалем. І я вельмі рада, што выбралі нашу прадзюсарскі цэнтр «Залатыя галасы». Нягледзячы на вялікі аб'ём працы, мы атрымліваем калясальнае задавальненне.

— Фестываль «Вытокі» раскрывае спартыўны, турыстычны патэнцыял горада. А ці не было ў вас думак раскрыць яго творчы патэнцыял і прыцягнуць да ўдзелу ў канцэртнай праграме мясцовыя калектывы?

— Уключыць у канцэртную праграму мясцовыя калектывы, якія ты не бачыў, — вялікая рызыка. Але мы даём мясцовым талентам сябе раскрыць, выступіць на фестывальнай сцэне. Для гэтага і праводзіцца вакальны конкурс. Найлепшых спевакоў дакладна не прапусцім!

— Дарэчы, раскажыце, калі ласка, як праходзіць вакальны конкурс...

— Выступленні на фестывалі — гэта ўжо паўфінал. Да гэтага ўсе ахвотныя прысылаюць нам на сайт відэа сваіх жывых выступленняў. Адразу скажу, што ёсць тыя, хто спрабуе хітраваць і прысылае відэа выступлення пад фанаграму. У нашым журы прафесійныя музыканты, і яны заўсёды могуць адрозніць жывы гук. Таму так рабіць не трэба. Журы адбірае сем чалавек у катэгорыі 12—16 гадоў і сем чалавек у катэгорыі 17—30 гадоў. Яны і выступаюць на фестывальнай сцэне перад публікай і перад журы. Уладальнікаў першых месцаў мы запрашаем на фінал. У мінулым годзе пераможца ў дарослай катэгорыі па Гродзенскай вобласці стаў таксама пераможцам шоу «Х-фактар». Сёлета ён едзе ў Навагрудак ужо як артыст. У фінале вакаліста спаборнічаюць за Гран-пры фестывалю. У мінулым годзе яго атрымала юная брасцяўчанка Сафія Рустамава. Яна атрымала аўтарскую песню, напісаную спецыяльна для яе кампазітарам Валерыем Шматам, і прэзентавала яе ў навагодніх эфіры тэлеканала «Беларусь 1». А цяпер яна з гэтай песняй адкрывае фестываль. «Вытокі» — гэта першы крок да асабістага Алімпу.

— Алеся, падчас фестывалю было нешта такое, што б вас вельмі здзівіла ў нашых людзях?

— Сёлета ў вакальным конкурсе мяне вельмі здзівіла Брэсцкая вобласць. Адбіраючы канкурсантаў, члены журы былі ў замяшальніцтве. Яны казалі, што можна адбіраць усіх! Але трэба было выбраць толькі 14 чалавек. Яны ўсе былі выдатныя! Дзяўчынка 16 гадоў выдала шыкоўнае мецца-сапрана, у яе акадэмічны голас, як у оперной спявачкі. Якраз тады ў журы быў саліст Вялікага тэатра Тарас Прысяжнюк, ён падкрэсліў, што ў гэтай дзяўчынкі вялікая будучыня. Яшчэ адна дзяўчынка-народніца спявала цудоўныя песні, якія цікавыя і сёння. Адна канкурсантка ўжо на фестывалі сказала, што ў яе ёсць тэхрайдар. Яя вельмі пачытала — у «Драздоў» прасцей. Зранку прыехалі ея музыканты, падключалі сваю апаратуру. Атрымалася вельмі цікава, салістка эстрадніца, а музыканты — у стыліштыцы сельскага бэнда з баянам, скрыпкай. На тым конкурсе ўсе былі супер.

Што датычыцца гледачоў... Зноў жа, Брэсцкая вобласць. Столін вельмі спадабаўся. Калі мы на першую рабочую сустрэчу туды прыехалі, у нас спыталі, ці ведаем, хто такія палешукі. Мы, канешне, адказалі, што гэта людзі, якія жывуць на Палессі. Але нам сказалі, што паляшук — гэта той, «хто поле шукае». Яны ўмеюць і працаваць, і адпачываць, вельмі адкрытыя. І на «Вытоках» мы гэта адчулі.

— А калі казаць пра фестывальныя гарады, якія запомніліся больш?

— У мінулым годзе мне запомнілася ўсё лета, калі мы перазжджалі з аднаго горада ў другі. Чатыры дні на тыдзень праходзілі ў фестывальным горадзе. Потым на пару дзён у Мінск — і зноў на фестываль. Запомнілася Орша, гэта быў другі горад у мінулым годзе. Атмасфера надзвычай сямейная. Адпрацаваўшы амаль да 11 вечара — мы ж цэлы дзень за сцэнай — я пайшла па каву. Стала ў чаргу і убачыла людзей, якія не скардзіліся на чэргі, а ўсміхаліся. Яны абмяркоўвалі свята, як яно ім спадабалася. Гэта атмасфера ўсеагульнай радасці настолькі зараджае, што ўжо хочацца рабіць наступны праект. Вось адкуль бярэцца сілы — ад рэакцыі людзей, дзеля якіх рыхтуеш свята.

— Алеся, на ваш погляд, у чым унікальнасць фестывалю «Вытокі»?

— Фестываль сатканы з яркіх момантаў, у якіх кожны можа для сябе нешта знайсці. На першы погляд, гэта супрацьлеглыя рэчы, але яны знаходзяцца побач. І гэтая мазаіка дае фестывалю «Вытокі» ўнікальнасць. Калегі з іншых краін з цікавасцю назіраюць за фестывалем. Ну дзе яшчэ ўбачыш спартыўныя спаборніцтвы і адначасова, напрыклад, майстар-клас па маляваных дыванах, старажытнай беларускай традыцыі ці канцэрт арганнай музыкі і спаборніцтвы па брэйк-дансе. Усё гэта аб'ядноўвае фестываль «Вытокі». Усё гэта на розныя густы, на розная гледача і на тых, каму цікава ўсё.

Валерыя СЦЯЦКО.

Фота з асабістага архіву гераіні і НАК Беларусі.

У некалькі найбліжэйшых месяцаў Еўрапейскі саюз чакаюць «нясмачці», якія могуць прывесці да росту інфляцыі. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва PIA «Навіны» са спасылкай на газету The Financial Times. У прыватнасці, еўразона аказалася ў зоне рызыкі ўзнікнення рэцэсіі. На думку FT, Еўрапейскі цэнтральны банк павінен спыніць займацца грашова-крэдытнай падтрымкай эканомікі Еўрасаюза і ўзняць працэнтныя стаўкі. У маі інфляцыя ў ЕС перавысіла 8 працэнтаў, але заместэканомі еўрапейскія краіны плануюць павялічыць выдаткі. Прычым такое рашэнне было прынята на фоне нязначнага росту ВУП еўразоны: у апошнім квартале мінулага года гэты паказчык павялічыўся толькі на нязначныя 0,3 працэнта, а сёлета ў першым квартале — увогуле на 0,2. Адмена каранавірусных абмежаванняў прывядзе да росту попыту, аднак ён будзе стрымлівацца з-за росту цэн на энерганосьбіты. Як заўважаюць эксперты, цяпер ёсць прыкметы таго, што рост цэн на тавары і паслугі ў Старым Свеце становіцца больш маштабным, адпаведна павялічваецца і сацыяльнае напружанне ў грамадстве. Чаму калоціць Еўропу?

К@нтыненты

ТРАСЦА СТАРОГА СВЕТУ

Чаму калоціць Еўропу?

ЦЭНАВАЕ РАЛІ

Еўропа і ЗША сутыкнуліся з небывалым ростам інфляцыі. Францыя, Бельгія, Германія, Іспанія, Чэхія, Данія — адна за адной еўрапейскія краіны ўключаюцца ў наймацнейшую за дзесяцігоддзі інфляцыю. Людзям даводзіцца эканоміць на ўсім, у тым ліку на прадуктах харчавання, піша Baltnews.

Упершыню за 50 гадоў узровень інфляцыі ў Германіі дасягнуў рэкордных 7,9 працэнта. Больш за ўсё рост цэн ударыў па бедных сем'ях. Апытанне ARD паказала, што амаль палова жыхароў Германіі (47 працэнтаў) вымушана эканоміць на асноўным — прадуктах і электраэнергіі. З улікам стану спраў амаль 60 працэнтаў выказалі свае неадабрэнне дзеянням урада Германіі.

Падобная сітуацыя назіраецца і ў Польшчы. Каля 90 працэнтаў сем'яў вымушаны скарачаць траты з-за росту цэн на прадукты харчавання і электраэнергію. На падліках выданя Rzeczpospolita, практычна кожная трэцяя хатняя гаспадарка зводзіць канцы з канцамі.

У Францыі грамадзяне вымушаны адмаўляцца ад падгузкаў і такім чынам эканомяць на карысць аплаты электраэнергіі, паліва і пітной вады. Упершыню за некалькі дзесяцігоддзяў інфляцыя ў краіне пабіла ўсе рэкорды, падскочыўшы на 5,2 працэнта. Грамадзяне скардзяцца, што пачалі сачыць за зніжкамі ў супермаркетах, каб сэканоміць. Між тым урад краіны плануе выдаваць прадуктовыя талоны жыхарам з нізкімі даходамі. Такія меры сацыяльнай падтрымкі могуць спатрэбіцца васьмі мільёнам французаў, якія ўжо зараз не могуць дазволіць сабе якасныя прадукты харчавання.

Інфляцыя ў Вялікабрытаніі за апошнія месяцы б'е рэкорды. Пры гэтым Банк Англіі чакае яе паскарэння да двухзначных лічбаў (звыш 10 працэнтаў) да канца года. Мільёны брытанскіх сем'яў сутыкнуліся з беспрэцэдэнтным ростам цэн на электрычнасць і газ пасля павышэння ў красавіку коштавага парога на энергію на 54 працэнты. Паводле даных брытанскага выдання The Guardian, з-за росту цэн на энергарэсурсы, выкліканага санкцыямі супраць Расіі, узімку шэсць мільёнаў хатніх гаспадарак у Вялікабрытаніі могуць сутыкнуцца з адключэннем электрычнасці.

З-за павелічэння кошту электраэнергіі, паліва і ўгнаенняў у маі рост цэн на прадукты харчавання ў Вялікабрытаніі дасягнуў найвышэйшага ўзроўню за апошнія 13 гадоў. Эксперты лічаць, што цэны ў краіне яшчэ далёкія ад пікавых паказчыкаў. Шэраг кампаній, якія працуюць у сферы харчовых тавараў, папярэдзілі, што кошт іх прадукцыі будзе павялічвацца.

Найвышэйшы ўзровень інфляцыі фіксуецца ў краінах Балтыі. Эстоніі з паказчыкам у 20,1 працэнта ўзначаліла антырэйтынг краін еўразоны па тэмпах росту цэн у маі. Эксперты зазначаюць, што рост інфляцыі абумоўлены павышэннем кошту энерганосьбітаў, харчавання, прамысловых тавараў, а таксама паслуг. Пры гэтым чакаць запаволення павышэння цэн у найбліжэйшыя месяцы не варта. Паводле некаторых прагнозаў, інфляцыя можа запаволіцца да канца года. Аднак верагоднасць дэфляцыі вельмі нізкая: цэны, хутчэй за ўсё, так і застануцца вельмі высокімі.

БАНКРУЦТВА І БЕСПРАЦОЎЕ

Энергетычны крызіс сур'ёзна ўдарыў па еўрапейскіх кампаніях. Не вытрымліваючы росту цэн на энерганосьбіты, вытворцы Старога Свету зніжаюць аб'ёмы вытворчасці, а ў некаторых выпадках закрываюць свае заводы. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле амерыканскага выдання The Wall Street Journal, паведаміла RT. Гадамі прамысловыя прадпрыемствы ў Еўропе працавалі дзякуючы танным

энергарэсурсам, якія закупляюцца ў Расіі. Аднак пасля пачатку канфлікту на Украіне сітуацыя ў карані змянілася. Цэны на нафту і газ узляцелі, а значыць, і выдаткі на вытворчасць рэзка ўзраслі. Перш за ўсё пацярпелі вытворцы энергаёмістай прадукцыі — угнаенняў, сталі, хімікатаў.

Еўрапейскім кампаніям усё цяжэй вытрымліваць канкурэнцыю з іншымі вытворцамі, якія маюць вытворчыя магутнасці ў рэгіёнах, дзе кошт энерганосьбітаў значна ніжэйшы, чым у Еўропе. Так, расце канкурэнцыя з боку амерыканскіх кампаній, бо ў ЗША кошт блакітнага паліва ўтрая ніжэйшы, чым у Еўропе. Эксперты адзначаюць, што высокія цэны на нафту і газ адаб'юцца не толькі на прамысловай вытворчасці, але ў цэлым на эканамічным росце ў Еўропе. Так, прагназуецца, што нямецкая эканоміка, якая лічыцца найбуйнейшай у Еўропе, скарацыцца пад ціскам высокіх цэн на энерганосьбіты. Калі падача расійскага газу спыніцца, прамысловасць ФРГ не зможа нармальна функцыянаваць, тысячы немцаў могуць страціць работу.

Пагоня краін Еўропы за газам можа прывесці будучай зімой да дэфіцыту энергарэсурсаў, заўважыла CNN, прадракаючы «бойку» за блакітнае паліва. Еўрапейцы пачалі набыпераднікі скупляць звадкаваны прыродны газ (ЗПГ), дэстабілізаваўшы ўвесь рынак. Аднак калі краінам ЕС удасца «рэзка знізіць» залежнасць ад расійскага газу, агульнасцэны попыт на сыравіну да канца гэтага года перавысіць прапанову на 26 мільёнаў тон.

Адмовіўшыся ад расійскага газу, «Еўропа дастабілізавала ўвесь сусветны рынак ЗПГ, які ўступіў у новы год у стане няўстойлівай раўнавагі

энергарэсурсам, якія закупляюцца ў Расіі. Аднак пасля пачатку канфлікту на Украіне сітуацыя ў карані змянілася. Цэны на нафту і газ узляцелі, а значыць, і выдаткі на вытворчасць рэзка ўзраслі. Перш за ўсё пацярпелі вытворцы энергаёмістай прадукцыі — угнаенняў, сталі, хімікатаў.

